«МЫ РАЗУМЕЕМ, ШТО МЫ ВЫРАТАВАЛІ

ДА 9 МАЯ ТРЭБА ЎСЁ ПАСЕЯЦЬ. ПРАЦАВАЦЬ ДЗЕНЬ І НОЧ

У канцы красавіка самае важнае пытанне — ход пасяўной кампаніі. Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з ходам веснавых палявых работ у філіяле № 1 «Цэмагра» Беларускага цэментнага завода ў Касцюковіцкім раёне. Мінсельгасхарч сумесна з аблвыканкамамі вызначыў структуру пасяўных плошчаў сельскагаспадарчых раслін на 2024 год. У адпаведнасці з ёй, яравую сяўбу з улікам перасеву загінулых азімых плануецца правесці на плошчы 2,4 млн га, у тым ліку ў Магілёўскай вобласці — на 336,2 тыс. га. Гатоўнасць тэхнікі па краіне забяспечана і падтрымліваецца на ўзроўні 95 працэнтаў. Вядуцца работы па падрыхтоўцы кормаўборачнай тэхнікі для нарыхтоўкі травяных кармоў.

«Я толькі хацеў бы вас папярэдзіць, каб мы не селі на белага каня, шашку нагала і пайшлі. Трэба акуратна абыходзіцца і з рапсам, і з азімым ячменем. Гэта культуры вельмі далікатныя, яны патрабуюць поўных умоў надвор'я», — адзначыў Прэзідэнт. Ён настойвае на тым, што не трэба спяшацца засеяць палі, трэба найперш прааналізаваць, што можна атрымаць з гэтых палёў, думаць, што пасеяць. Пытанне нумар адзін, канешне, — тэхналогія.

Міністр сельскай гаспадаркі Сяргей Барташ далажыў, што ў краіне працягваецца сяўба яравых сельскагаспадарчых раслін, ужо засеяна звыш 1 млн га, або 45 працэнтаў ад плана, і 105 працэнтаў да ўзроўню мінулага года (у Магілёўскай вобласці — 43 працэнты ад плана і 116 працэнтаў да леташняга ўзроўню). Па словах міністра, сёлета на 25 тыс. га павялічаны пасевы кукурузы. «Не ведаю, з чаго вы зыходзілі, павялічваючы ці памяншаючы плошчы. Таксама хачу вас папярэдзіць: кукуруза, кукуруза, кукуруза... Нас вучоныя папярэджваюць, што мы павінны сеяць бабовыя. Таму кукурузай засеяць, а потым кіслым сіласам карміць скаціну — гэта таксама не справа. Нам трэба больш сенажу. Трэба вельмі акуратна на будучы год усё спланаваць, каб да севазваротаў мы не вярталіся, то-бок трэба на корманарыхтоўку звярнуць сур'ёзную ўвагу. За гэта спытаем сур'ёзна», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Асаблівую ўвагу Прэзідэнт даручыў звярнуць на пасеў і вырошчванне лёну, каб забяспечыць перапрацоўку якаснай сыравінай. «Каб у нас пасевы былі нармальныя. Нельга трымаць на кароткім павадку нашу фабрыку і льнозаводы. У Оршы збяромся — будзеш гэтай восенню даваць справаздачу», — папярэдзіў міністра беларускі лідар.

Як заўважыў у сваім дакладзе Сяргей Барташ, па некаторых культурах у асобных абласцях ёсць адставанне ад плана. Адна з прычын таму ў тым ліку і ападкі. «Ападкі — гэта не пытанне. Два-тры дні — і поле сухое, асабліва цяпер», — заўважыў на гэта Прэзідэнт.

«Сёння трэба па-ваеннаму сеяць. Па-ваеннаму. Дзень і ноч. Трэба цяпер укінуць збожжа ў глебу. Надвор'е будзе цёплае, вільгаць адыходзіць, таму трэба своечасова кінуць збожжа. Дзесьці трэба папрасіць механізатараў, дзесьці трэба ўладу даць такую, якую Сталін у гады вайны не меў. Да 9 мая мы павінны пасеяць усё, і кукурузу ў тым ліку. Таму трэба працаваць дзень і ноч. Ад гэтага нікуды не падзецца», — паставіў задачу беларускі лідар.

«ГЭТЫ ДОСВЕД ТРЭБА ВЫВУЧЫЦЬ»

Старшыня Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта Анатоль Ісачанка далажыў пра ход пасяўной кампаніі непасрэдна ў рэгіёне. Губернатар расказаў, што ў выкананне даручэння Прэзідэнта ў вобласці створана сем механізаваных атрадаў, якія забяспечаны тэхнікай. Гэтыя атрады займаюцца ўсім комплексам сельскагаспадарчых работ. Дзейнасць такіх атрадаў забяспечвае эфектыўнае выкарыстанне энерганасычанай тэхнікі. Як запэўніў Анатоль Ісачанка, колькасць механізаваных атрадаў будзе павялічана. «Вось 9 камбайнаў, намалот на адзін збожжаўборачны камбайн у атрадзе склаў 1623 тоны, па вобласці — 800. І механізатараў трэба менш, і зарплата ў людзей большая», — адзначыў губернатар. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэты нядрэнны досвед трэба вывучыць. Тым больш што, па яго словах, ён больш патрэбны ўсходу, чым захаду. Прэзідэнт таксама паставіў перад губернатарам задачу вырашыць праблему падзяжу жывёлы. Для Магілёўскай вобласці гэта сапраўды вялікая праблема.

«У НАС ДОБРАЯ ТЭХНІКА. АЛЕ НЯМА АДКАЗНАСЦІ ЛЮДЗЕЙ ЗА ГЭТУ ТЭХНІКУ»

Аляксандр Лукашэнка таксама азнаёміўся з узорамі новай і адноўленай сельскагаспадарчай тэхнікі айчыннай вытворчасці. І адразу — заява на злобу дня. «Нашы збеглыя, мярзотнікі, заклапаціліся, што ў нас камяні збіраюць людзі (школьнікі, студэнты, вайскоўцы і іншыя), а на захадзе ёсць тэхніка для гэтага. Ды ёсць у нас тэхніка. Але грошы лічыць трэба часам. І не ўсюды гэту тэхніку запусціш», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён растлумачыў, што тэхніку трэба запускаць там, дзе камянёў вельмі многа. А з невялікай колькасцю справяцца і людзі. «Усё мы маем. Толькі трэба глядзець, што, дзе і як ужываць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Як далажылі Прэзідэнту, айчынная машына, прызначаная для ўборкі камянёў, на 40 працэнтаў танейшая за польскія аналагі. На гэты момант лакалізацыя 85 працэнтаў, але працуюць над тым, каб яна была цалкам айчыннай вытворчасці.

Як працуе сельскагаспадарчая тэхніка, кіраўнік дзяржавы пракантраляваў асабіста. І абавязкова задаў некалькі пытанняў вадзіцелям, якія ў гэтым пытанні сапраўдныя прафесары. «У нас добрая тэхніка. Але ў нас няма адказнасці людзей за гэту тэхніку», — заўважыў Прэзідэнт. А гэта ўжо зона адказнасці профільнага міністра, губернатара, кіраўнікоў на месцах — выбудаваць гэту работу належным чынам. У цэлым, па словах Аляксандра Лукашэнкі, трэба максімальна павышаць лакалізацыю ў вытворчасці айчыннай сельгастэхнікі. А тым, хто яе выкарыстоўвае, самым уважлівым чынам сачыць за якасцю яе абслугоўвання.

ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАРАДАК

Асобна Прэзідэнт звярнуў увагу на дзейнасць індывідуальных прадпрымальнікаў. Гэтымі днямі кіраўнік дзяржавы падпісаў закон па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці, якім прадугледжаны шэраг новаўвядзенняў. «Мы там парадак навялі. Рашэнні прынятыя адпаведныя: іпэшнікам ты будзеш тады, калі трапіш у спіс гэтых іпэшнікаў, гэта значыць, будзеш ажыццяўляць той від работ, які будзе дазволена ІП. А то ў нас усе сталі іпэшнікамі і працаваць няма каму. Гэта не значыць, што мы ўсіх у стойла загонім, але павінен быць парадак», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

З такога ж падыходу павінны зыходзіць і кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў, якія далучаюць да сябе сельгасарганізацыі. Як прыклад — Беларускі цэментны завод. Па словах Прэзідэнта, такім прадпрыемствам раней мала ўвагі ўдзялялі. Але і кіраўнікам прадпрыемстваў не трэба забываць, што яны нясуць усю адказнасць за сельгасарганізацыі.

ПАКУЛЬ ВЁСКА ЗАБЯСПЕЧВАЕ КРАІНУ, ЯК КРАІНА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ВЁСКУ

Таксама Прэзідэнту паказалі аўтакраму арганізацый спажывецкай кааперацыі. На неабходнасць якаснага абслугоўвання сельскага насельніцтва і жыхароў аддаленых рэгіёнаў Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу 16 лютага на агульным сходзе прадстаўнікоў членаў Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў. Тады кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што трэба арганізаваць работу аўтакрам такім чынам, каб у вяскоўцаў была якасная замена стацыянарнай краме.

Адзін з такіх прыкладаў паказалі Аляксандру Лукашэнку ў Касцюковічах. Аўтакрама «Купава» выраблена Мінскім аўтамабільным заводам. Такая машына адпавядае ўсім патрабаванням: і тэхналагічным, і тэхнічным, і санітарным. Усім абсталявана. Аб тым, як працаваць на такой машыне, Прэзідэнт гаварыў непасрэдна з прадаўцом аўтакрамы Людмілай: «Дзякуй табе, Люда, за абслугоўванне людзей. Праца непростая, але ўдзячная: людзі вельмі ўдзячныя, калі прыязджаеш, так? Тым больш усё ёсць, што ў магазіне, проста аб'ёмы іншыя. А большы аб'ём табе, напэўна, і не трэба?». Людміла запэўніла кіраўніка дзяржавы, што гэта вельмі зручная, прасторная машына, для якаснага захавання прадуктаў ёсць халадзільнік і маразільная камера. «Гэта значыць, гэтай машыне быць, яна зручная?» — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. «Зручная», — запэўнілі кіраўніка дзяржавы. Старшыні праўлення Белкаапсаюза Інесе Караткевіч Прэзідэнт параіў устанавіць кантроль за работай гэтых машын, што зніме праблему абслугоўвання. Яна запэўніла, што гэта пытанне адпрацавана.

Як далажыла кіраўнік Белкаапсаюза, надаўняя інвентарызацыя паказала, што сёння на балансе падпарадкаваных арганізацый 633 аўтакрамы, 414 поўнасцю зношаныя. Інеса Караткевіч адзначыла, што за два гады спажыўкааперацыяй ужо набыта 86 новых машын. У гэтым годзе будзе пастаўлена яшчэ 118 адзінак. Усяго ж на працягу некалькіх гадоў Белкаапсаюзу неабходна закупіць 414 аўтакрам. Кошт адной машыны — каля Br225 тыс., яна здольна перавозіць да 5,5 т тавару. Аляксандр Лукашэнка даручыў прапрацаваць пытанне закупкі новых аўтакрам для Белкаапсаюза. Пры гэтым асноўныя затраты павінны легчы на спажыўкааперацыю, пры дапамозе аблвыканкамаў. Аднак Прэзідэнт запатрабаваў не забываць і пра той аўтапарк, што ўжо ёсць, наколькі гэта магчыма, аднаўляць старыя машыны.

ЛІШКАЎ І ПАЛАЦАЎ НЕ ТРЭБА. РАМЁСТВЫ — ГЭТА ЗОЛАТА

Пасля пытанняў харчовай бяспекі кіраўнік дзяржавы ўдзяліў увагу духоўнаму складніку. Аляксандр Лукашэнка наведаў раённы Цэнтр культуры, дзе азнаёміўся з тым, як арганізаваны вольны час жыхароў Касцюковіцкага раёна. Новы будынак раённага Цэнтра культуры быў пабудаваны ў 2021 годзе ў рамках Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2021—2025 гады. Гэта сучасны аб'ект, дзе прадстаўлены комплекс культурных паслуг. Тут дзейнічае раённы Дом рамёстваў, дзіцячая школа выяўленчага мастацтва. Штогод праводзіцца больш за 600 культурных мерапрыемстваў. Адно з іх наведаў і Прэзідэнт — рэпетыцыю выхаванцаў ваенна-патрыятычнага клуба «Зубр» і ўзорнага харэаграфічнага калектыву «Мазаіка» Касцюковіцкай дзіцячай школы мастацтваў.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што падобныя культурныя ўстановы, безумоўна, павінны быць. Але не трэба будаваць палацы, лепш сэканоміць грошы на будаўніцтве аб'ектаў і павысіць зарплаты людзям. Акрамя таго, як нагадаў Прэзідэнт, бюджэтныя сродкі патрэбны і ў ахове здароўя, і ў адукацыі.

«Я за тое, каб і рамёствы, якія павінны быць, і нейкі краязнаўчы музей, і бібліятэкі былі. Павінна гэта быць. Але павінна быць аптымальна», — арыентуе кіраўнік дзяржавы. Аляксандру Лукашэнку паказалі вырабы народных майстроў, творчасць маладых і старэйшых мастакоў. Асаблівую цікавасць Прэзідэнта выклікала ткацтва, традыцыі якога ў рэгіёне працягвае народны майстар Валянціна Волкава. «Вось гэта трэба падтрымліваць, развіваць. Але ці трэба «палацы» для гэтага? Можа, зарплату большую даць, яшчэ штосьці... Вось гэта золата — рамёствы старажытныя — мы іх вельмі беражом, падтрымліваем», — падкрэсліў беларускі лідар. На памяць Прэзідэнту падарылі ручнік, створаны касцюковіцкімі майстрамі.

«ПАКУЛЬ ВЫ ЁСЦЬ, КРАІНА БУДЗЕ НЕЗАЛЕЖНАЙ І СУВЕРЭННАЙ»

Традыцыйная частка рабочых паездак Прэзідэнта ў раённыя цэнтры — зносіны з мясцовымі жыхарамі. Касцюковічы выключэннем не сталі. Тым больш, як успомніў Аляксандр Лукашэнка, ён не быў тут ужо пяць гадоў. «Шчыра кажучы, крыху здзівіўся, што вы захавалі ўсё ў парадку і нават на зямлі нядрэнна працуеце. Гэта вельмі важна», — прызнаўся кіраўнік дзяржавы. Ён высока ацаніў работу жыхароў Касцюковіцкага раёна. А сам горад ён назваў «Мінскам на ўсходзе нашай цудоўнай краіны» і падзякаваў за гэта мясцовым жыхарам.

«Дзякуй вам за тое, што вы сапраўдныя. Нутром адчуваю, што вы сапраўдныя. Мастацкая самадзейнасць, рамёствы — усё сваё. Усё, чаму, я ўпэўнены, сёння можа пазайздросціць буйны горад, у тым ліку і сталіца. Гэта вялікая справа, мы будзем падтрымліваць у гэтым плане вас», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Асобна ён падзякаваў мясцовым жыхарам за тое, што яны захавалі старажытныя рамёствы, вучаць ім дзяцей і ўсебакова развіваюць маладое пакаленне. «Вы захоўваеце нашы старажытныя традыцыі, вы добра спяваеце, вы ствараеце на злобу дня тое, што трэба стварыць. Таму і кажу, што вы сапраўдныя, вы патрыятычныя. Нутром адчуваю, што вы сапраўдныя людзі. Пакуль вы ёсць, краіна будзе незалежнай і суверэннай і ніхто нам не страшны», — сказаў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэту паездку ў Касцюковіцкі раён не трэба разглядаць, як частку «чарнобыльскага шляху Прэзідэнта», калі ён часта наведваў раёны, што пацярпелі ад наступстваў аварыі. «Мы сёння менш гаворым пра гэта. Бо разумеем, што выратавалі сваю краіну. Сёння мы разумеем: тут не проста трэба жыць, тут людзі жывуць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што ў гэтым рэгіёне дастаткова высокі ўзровень нараджальнасці. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што дзяржава і ў далейшым будзе падтрымліваць шматдзетныя сем'і. Перш за ўсё — жыллём. Сем'і з траімі і больш дзецьмі без размоў па-за чаргой павінны быць забяспечаны жыллём.

«МЫ ЗРАБІЛІ МУДРА, МЫ ВЫТРЫМАЛІ»

Жыхары Касцюковічаў задалі свае пытанні Прэзідэнту. Адно з іх — актуальнае. У Прэзідэнта пацікавіліся яго бачаннем далейшага развіцця айчыннай атамнай энергетыкі і папрасілі пракаментаваць той факт, што заходнія суседзі, якія актыўна выступалі супраць будаўніцтва Беларускай АЭС, сёння будуюць станцыі ў сябе. «Напэўна, наша грамадства ўжо перахварэла на паслячарнобыльскі сіндром. Калі сказаць аб тым, што я вельмі перажываў, калі прымаў рашэнне аб будаўніцтве атамнай станцыі, — гэта нічога не сказаць. Такую праблему ўзяць на сябе, хоць ты і Прэзідэнт, складана было ў чарнобыльскай рэспубліцы. Я рызыкнуў, а вы зрабілі. Сёння мы разумеем, што зрабілі правільна. Гэта самы чысты від энергіі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што чалавечы фактар і волю выпадку, як гэта было з Чарнобыльскай станцыяй, якая да таго ж была эксперыментальная, выключаць нельга. І тым больш гэта не нагода бяздзейнічаць і чакаць, калі з неба шчасце ўпадзе.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што Беларуская атамная станцыя будавалася не толькі для таго, каб забяспечыць краіну электраэнергіяй, хоць гэта найперш: «Я хацеў, каб у нас у Беларусі новая школа з'явілася. Будаўніцтва, эксплуатацыя станцыі пацягнулі за сабой адукацыю. Нам трэба спецыялістаў цяпер рыхтаваць (што мы і робім), перабудоўваць адукацыю, рыхтаваць спецыялістаў». Прэзідэнт зазначыў, што беларускія спецыялісты актыўна пераймалі вопыт замежных калег. На Беларускай АЭС працавала і сёння працуе нямала расійскіх спецыялістаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)